# УСПАМІНЫ БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

## Праз творы, выстаўленыя ўпершыню, і кнігу ў памяць пра мастака



*Аксана Аракчэева «І толькі надпіс Веранiка», 2009 г. На партрэце журналіст радыё «Культура» Іна Наркевіч.*

**Прозвішча сям'і Аракчэевых у Мінску гучыць даволі часта. Творчую дынастыю любяць і паважаюць як прадстаўнікі айчыннай арт-прасторы, так і аматары мастацтва. Аксана Аракчэева — малодшая дачка Барыса Аракчэева, яна арганізавала серыю выставак, прысвечаную памяці любімага таты. Разам з работамі знакамітага мастака творца прэзентуе і свае мастацкія творы. Напрыканцы ліпеня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася новая сумесная выстаўка аўтараў пад сімвалічнай назвай «Шчасце быць разам».**

Аксана пяшчотна ставіцца да кожнага ўспаміну пра тату, яго творы аберагае, але на паліцах не хавае. Імкнецца паказаць гледачам самыя розныя кірункі і тэхнікі, у якіх працаваў Барыс Аракчэеў.

— Першапачаткова я задумвала выставачны праект на год у памяць пра тату, — расказвае Аксана Аракчэева. — Але калі стала пераглядаць работы, адшукваць розныя матэрыялы, зразумела, што праект нельга абмежаваць часавымі рамкамі. Бо мне ёсць што расказаць пра бацьку, у нашай сям'і захавалася неймаверная спадчына. Быў час, калі імя Барыса Аракчэева было забыта. Тата быў чалавекам сціплым, але ён любіў маляваць, жывапіс быў яго жыццём. Я ж вельмі хачу, каб памяць пра бацьку жыла, каб яго імя гучала.

Аксана вырашыла, што калі будзе прадстаўляць творы, то так, каб не паўтарацца. Для кожнай наступнай экспазіцыі яна падбірае карціны, якія не выстаўляліся ўвогуле альбо дэманстраваліся даўно.

— Гэтым разам я вырашыла паказаць акварэльныя творы, якія не надта добра ведае глядач, некаторыя работы 60 — 70-х гадоў дэманструюцца ўпершыню, — падкрэсліла Аксана Аракчэева. — Наступны раз планую выставіць работы, якія нават сам тата нікому не паказваў. Яны беражліва захоўваюцца ў нашай майстэрні.



*Барыс Аракчэеў «Казематы мужнасці», 2001 г.*

Мае творы — таксама своеасаблівы сюрпрыз: я выстаўляю партрэты вядомых людзей, якія ўнеслі ўклад у айчынную культуру, і серыю работ «Мядзельшчына пісьменніцкая», якая таксама паказана ўпершыню.

Дарэчы, яшчэ адна ідэя праекта — стварэнне кнігі, прысвечанай Барысу Аракчэеву.

— Ёсць альбом, прысвечаны творчасці бацькі, які вельмі добра напоўнены ілюстрацыйным матэрыялам, — тлумачыць Аксана Аракчэева. — Цяпер наша сям'я вырашыла падрыхтаваць новую кнігу такім чынам, каб у ёй было больш біяграфічных звестак, успамінаў сучаснікаў. Падчас падрыхтоўкі матэрыялу для кнігі я чытала ўспаміны сяброў таты і быццам бы сама кожны раз адкрывала яго наноў. Гэта дзіўна, калі роднага чалавека раскрываеш, нават калі яго больш няма. У кнігу акрамя ўспамінаў увойдуць інтэрв'ю бацькі пра вайну, пра жыццё. Да гэтай працы мы вырашылі прыцягнуць мастацтвазнаўцу, які зацікаўлены творчасцю бацькі, так да нашай каманды далучылася маладая мастацтвазнаўца Ксенія Сяліцкая, якая імкнецца дэталёва разабрацца не толькі ў творчасці бацькі, але і ў асаблівасцях таго перыяду жыцця.



*Барыс Аракчэеў «Мазаіка лета», 1973 г.*

**Вікторыя АСКЕРА**